# ТЫ ДУША БЕЛАРУСІ – БЕЛАРУСКАЯ МОВА!

***Вобразная, пявучая, мілагучная, сакавітая і такая родная! Беларуская мова заўсёды славілася і славіцца сваёй прыгажосцю і непаўторнасцю. У нашым універсітэце ёсць выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты і ліцэісты, якія асабістым прыкладам паказваюць, што размаўляць на беларускай мове – нясорамна, чытаць беларускую літаратуру – цікава, падарожнічаць па Беларусі – пазнавальна, а шанаваць і захоўваць традыцыі – ганарова і важна.***

*Я папрасіла машэраўцаў адказаць на пытанні анкеты:*

*1. Што б вы назвалі месцам сілы беларусаў?*

*2. Ваша любімая беларуская цытата?*

*3. Назавіце 3 – 5 вашых любімых слоў на беларускай мове.*

*4. Як вы лічыце, з чаго можна пачаць вывучэнне беларускай мовы?*

*5. На вашу думку, які аб'ект матэрыяльнай ці нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі трэба ўключыць у спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА? Чаму?*

*6. Якая ваша любімая беларуская страва?*



**Вольга РАДЗЮЛЬ, старшы выкладчык кафедры мовазнаўства:**

**1.** Месца сілы – гэта месца, якое супакойвае і насычае станоўчай энергіяй. Іх у мяне шмат, але найперш – мястэчка Бакшты ў Гродзенскай вобласці. У гэтай вёсцы жыве мая бабуля, тут я заўсёды праводзіла летнія канікулы і зараз у адпачынку імкнуся прыехаць.

**2.** Вельмі падабаюцца словы паэта Пімена Панчанкі: «Без чалавечнасці не будзе вечнасці». На жаль, сучасныя рэаліі такія, што некаторыя забыліся, што такое чалавечнасць. Хочацца ўсё ж, каб людзі сталі больш спагадлівымі, міласэрнымі і неабыякавымі да лёсу іншых людзей.

**3.** Мае любімыя словы: водар, гасцінец, знічка, блакіт, пяшчота.

**4.** Галоўнае – проста пачаць і не баяцца рабіць памылкі. Кожны дзень чытаць па-беларуску, слухаць беларускія песні і па магчымасці старацца больш размаўляць на мове.

**5.** Па-першае, Брэсцкую крэпасць – адно са знакавых месцаў Беларусі. Яшчэ я вельмі спадзяюся на рэстаўрацыю і ўключэнне ў спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА Крэўскага і Гальшанскага замкаў. Спіс магу працягваць бясконца: касцёл Святой Троіцы ў Гервятах, сядзіба Агінскіх у Залессі і інш.

**6.** Любімая беларуская страва – бульбяная каўбаса. Мне яе ў дзяцінстве гатавала бабуля. Да цёртай сырой бульбы яна дадавала сала, абсмажанае з цыбуляй, і крыху мукі. Гэтай сумессю запаўняла свіную кішку, абсмажвала на патэльні да залацістай скарыначкі і адпраўляла ў печ на 20 – 25 хвілін.



**Віталь ПАДСТАЎЛЕНКА, дацэнт кафедры літаратуры:**

**1.** Мне думаецца, што трапным адказам могуць служыць мудрыя словы Уладзіміра Караткевіча: «На Беларусі Бог жыве!».

**2.** Нядаўна мне трапілася цытата велічнага Уладзіміра Караткевіча: «Людзі нараджаюцца роўнымі перад сваім сумленнем». У гэтай думцы пра першародную, дзіцячую чысціню маецца вялікі падтэкст. Пісьменнік заклікае людзей заўжды памятаць пра маральнасць сваіх «дарослых» учынкаў.

**3.** Для мяне асабліва «цёплымі» ці «сонечнымі» беларускімі словамі з'яўляюцца вітаю, усмешка, вясёлка.

**4.** Мая парада простая: як існаванне любога чалавека пачынаецца з маленства, так і шлях да пакуль загадкавага моўнага свету ляжыць праз казкі і песні гэтай зямлі.

**5.** З велізарнай спадчыны Беларусі акцэнтую асаблівую ўвагу на Сафійскім саборы як сімвале нашай духоўнасці і гісторыка-культурных традыцый і Брэсцкай крэпасці як сімвале выключнай мужнасці і гераізму нашых продкаў.

**6.** Для мяне асаблівы смак маюць хрэстаматыйныя дранікі і камы з душамі (зразы). А ўвогуле вобраз бульбы лічыцца беларускім нацыякансалідуючым этнамаркерам.



**Яна БАРЫСЕВІЧ, студэнтка 4 курса ФГіМК:**

**1.** Асабіста для мяне месцам сілы і еднасці беларусаў з'яўляецца Нацыянальны санктуарый Маці Божай у Будславе. Маю вялікую радасць ісці ў Будслаў пілігрымам кожнае лета, дзяліцца сведчаннем сваёй веры з іншымі. Малітва перад цудатворным абразом Маці Божай Будслаўскай, безумоўна, мае вялікую моц.

**2.** Мне вельмі падабаецца знома (філасафема) вядомага беларускага паэта Алеся Разанава: «Усе знаходзяцца на аднолькавай адлегласці ад Бога, але на рознай да Бога». На маю думку, многія людзі ўсведамляюць тое, што існуе найвышэйшы Нехта, і для кожнага чалавека Ён свой. Але ў той жа час у сваім пазнанні, імкненні наблізіцца да Яго мы розныя.

**3.** Мае любімыя словы – мужнасць, сумленнасць, прыгажосць, веліч, справядлівасць.

**4.** Я лічу, што вывучэнне беларускай мовы варта пачаць з асабістага жадання. Бо, калі будзе жаданне, будуць і сілы, і імкненне ісці да пастаўленай мэты.

**5.** На маю думку, гэта адметныя беларускія святы, абрады, традыцыі. Напрыклад, такія, як хрэсны ход у вёсцы Станулі Глыбоцкага раёна.

**6.** Мая любімая беларуская страва – бабуліны налеснікі (наліснікі) ў печы.



**Васіль БАРАНОК, дацэнт кафедры карэкцыйнай работы, старшыня Савета ветэранаў універсітэта:**

**1.** Месцам сілы беларусаў лічу Буйніцкае поле пад Магілёвам, на якім савецкія салдаты разам з магіляўчанамі стрымлівалі націск фашысцкага войска. Іх подзвіг надае сілы і натхняе да гэтага часу.

**2.** «Мова – душа народа. Ёсць мова – ёсць народ. Няма мовы – няма народа». Я заўсёды заклікаю любіць і берагчы сакавітую, яскравую, родную беларускую мову. Мова – гэта найкаштоўнейшы духоўны скарб, крыніца яднання народа.

**3.** Гэта: «Дзень добры!», «Да пабачэння!», «Дзякуй!», «Калі ласка!», «Сябра!». Гэтыя словы я прапаную туркменскім і кітайскім студэнтам вывучыць на памяць, бо калі яны будуць дома расказваць пра Беларусь, то змогуць прывесці іх у прыклад, зрабіць добрую рэкламу нашай краіне.

**4.** Вывучэнне беларускай мовы трэба пачаць з вывучэння гісторыі рода чалавека, яго малой і вялікай Радзімы. З таго, што чалавеку трэба клапаціцца пра тое, як праславіць іх. І пастаянна думаць, што я ўжо зрабіў, раблю і яшчэ буду рабіць дзеля гэтага.

**5.** Я б прапанаваў унесці ў спіс сусветнай культурнай спадчыны помнік героям-вайскоўцам, загінуўшым падчас Айчыннай вайны 1812 года ў Віцебску.

**6.** У дзяцінстве матуля любіла нас частаваць тонкімі блінамі, якія мы макалі ў тук на патэльні, на якой была падсмажана свежаніна з хатнімі курынымі яйкамі. Смак я памятаю да гэтага часу.



**Сяргей МІХАЙЛАЎ, старшы выкладчык кафедры сацыяльна-педагагічнай работы:**

1. Сілай Беларусі, на маю думку, з'яўляюцца родная мова, духоўнасць і гісторыя. А матэрыяльным увасабленнем выступаюць мясціны і помнікі, якія адлюстроўваюць непаўторнасць і шматвяковую даўніну беларускай нацыі – Нясвіжскі палац, Мірскі замак, Сафійскі сабор.

2. Маёй улюбёнай беларускай цытатай з'яўляюцца словы паэта Алеся Разанава: «Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор, і гэты твор – мова».

3. Любімымі для мяне беларускімі словамі з'яўляюцца гонар, сумленне, Айчына, мова, натхненне.

4. Варта распачынаць з чытання беларускіх кніг. Хай гэта будуць дзіцячыя казкі, прыгодніцкія творы Уладзіміра Караткевіча, вершы Максіма Багдановіча або Ніла Гілевіча.

5. Мяркую, што ў спіс маглі б быць унесены тры рэдакцыі Статута Вялікага Княства Літоўскага – першай у Еўропе і свеце Канстытуцыі старажытнай беларускай дзяржавы.

6. Я вельмі люблю звычайную беларускую таўчоную бульбу са смятанай. А з дзяцінства запомніліся бабуліны бульбяныя тонкія бліны «бульбянікі».



**Караліна ВЯЛІЧКА, студэнтка 2 курса ФГіМК:**

1. Месцам сілы беларусаў з'яўляецца наша ментальнасць. Беларус вельмі сціплы, але шчыры, сумленны і гасцінны.

2. Мне падабаюцца словы Уладзіміра Караткевіча: «Рабі нечаканае, рабі, як не бывае, рабі, як ня робіць ніхто і тады пераможаш».

3. Мае любімыя словы на беларускай мове звязаны са светлымі пачуццямі: каханне, пяшчота, лагода. А таксама з тым, што з'яўляецца неад'емнай часткай майго жыцця: мова, вёска.

4. У свой час я пачала вывучаць беларускую мову з кніг класікаў, а пад рукой заўсёды быў слоўнік. Сёння я б раіла спачатку акунуцца ў свет музыкі і паслухаць беларускія песні.

5. Думаю, варта ўключыць касцёл Святой Барбары ў Віцебску. Ён пабудаваны з чырвонай цэглы, спалучае неараманскі стыль і неаготыку.

6. Гэта калдуны. Гатуюць іх на аснове бульбянога цеста. Для гэтага трэба падраць бульбу на тарцы, дадаць 2 – 3 яйкі, некалькі лыжак мукі, пасаліць. Для начыння спатрэбяцца мяса, цыбуля, соль і перац. Трэба зляпіць самі аладкі і загарнуць у іх начынне. Калдуны выпякаюцца на патэльні і падаюцца са смятанай.



**Мікалай ПАРХІМОВІЧ, дацэнт кафедры гісторыі і культурнай спадчыны:**

1. Я лічу, што месца сілы там, дзе ты нарадзіўся. Для мяне гэта вёска Скамарошкі на мяжы Гродзенскай і Мінскай абласцей. Гэта мясцовасць, дзе бярэ пачатак Вялікае Княства Літоўскае. У дзесяці кіламетрах ад вёскі знаходзіцца Мірскі замак. Таму, лічу, невыпадкова я люблю гісторыю.

2. Гэта словы Францішка Багушэвіча: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!». Я ўпэўнены, што беларусы і мова – гэта адзінае цэлае, існаваць паасобку яны не могуць.

3. Маці, бацька, жонка, дачка і сын.

4. Лічу, што патрэбна спрабаваць размаўляць на беларускай мове. Па-першае, знайсці сябра-аднадумца і паставіць сабе мэту. Па-другое, кожны дзень весці размовы толькі па-беларуску. Па падручніках мову вывучыць немагчыма, а з дапамогай практыкі ўсё атрымаецца.

5. Можна, напрыклад, уключыць Ружанскі палацавы комплекс Сапегаў, Крэўскі замак.

6. Гэта пальцам пханая каўбаса, якую трэба сушыць над печкай некалькі тыдняў. А яшчэ ўспамінаецца самапечаны хлеб на кляновых лістах.



**Таццяна ОБРАЗАВА, карэктар рэдакцыйна-выдавецкага аддзела:**

1. Месцам сілы беларусаў, на маю думку, з'яўляюцца любоў і павага да роднай краіны і малой радзімы. Калі прыязджаю дадому ў вёску Гарадзішча Докшыцкага раёна, то мяне ахоплівае трапяткое пачуццё. Успамінаецца дзяцінства, дзе кожны чалавек быў шчаслівы.

2. Мне падабаецца цытата Уладзіміра Караткевіча: «Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю мову – усё згубіў». Калі чалавек не імкнецца ведаць сваю гісторыю, культуру, мову, то пачынае знікаць як асоба.

3. Калі ласка, смачна есці, немаўлятка, дзьмухавец, удзячнасць.

4. Вывучаць беларускую мову неабходна пачынаць з усведамлення і жадання яе ведаць. Трэба размаўляць з носьбітамі мовы, глядзець тэлеперадачы і слухаць беларускамоўнае радыё. Ды купіць, напрыклад, каляндар на беларускай мове.

5. Такім аб'ектам нематэрыяльнай культуры, на маю думку, з'яўляецца беларускі ручнік і ўсе традыцыі, звычаі, святы, звязаныя з гэтым відам ткацтва.

6. Мая любімая страва, якую гатавала ў дзяцінстве бабуля, – гэта бульбянікі. Трэба было зварыць бульбу, абабраць ад шкарлупіння і падсыпаць ячменнай мукі, крыху солі. Потым у драўлянай ступе драўляным таўкачом збіць дадзеную масу. Дзесьці паўгадзіны спатрэбіцца, каб цеста стала, як пух. Потым з гэтай масы ляпілі піражкі і запякалі ў печы. Елі з мясам, супам, малаком.



**Вераніка КАРАСЁВА, навучэнка 10 «Г» класа Ліцэя ВДУ:**

1. Месцам сілы беларусаў, на мой погляд, з'яўляецца Полацк. Усе асноўныя вехі развіцця Беларусі звязаны з гэтым горадам. Там нарадзіліся асветніца Ефрасіння Полацкая і першадрукар Францыск Скарына.

2. «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся». Мая Радзіма – гэта дзіўная краіна са сваім цікавым мінулым, поўным легенд і паданняў, багатай культурнай спадчынай. Беларусы – таленавітыя і працавітыя людзі, якія славяцца сваёй мужнасцю, жыццёвай мудрасцю і сілай духу, цэняць сваю зямлю і мову. Наш народ вольны, незалежны і шчыры.

3. Мае любімыя словы – наваколле, прыгажуня, Бацькаўшчына, хвілінка, каханне.

4. Вывучэнне беларускай мовы трэба пачынаць з народных забаўлянак, лічылак, калыханак. Лічу, што яны дапамагаюць адчуць прыгажосць і непаўторнасць роднай мовы.

5. У спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА трэба ўключыць помнік літары «Ў», прысвечаны 22-й літары беларускага алфавіта. Ён знаходзіцца у Полацку.

6. Мая любімая беларуская страва – клёцкі, якія мы даволі часта робім усёй сям'ёй. Я люблю іх з самага дзяцінства.

**Алеся МЯДЗІЛЬ.**

*Апытанне студэнтаў ВДУ – прадстаўнікоў розных краін – пра іх стаўленне да роднай мовы чытайце з дапамогай QR-кода на VSUonline.*